Тамара Круталевіч



# ТЫДЗЕНЬ НЕКУРЭННЯ: КРЭАТЫЎНЫ ФАРМАТ



Загадчык аддзела Бярэзінскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы

Сусветны дзень некурэння актывізаваў да дзеяння многія дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі. Бярэзінская раённая бібліятэка (РБ) прапанавала свае мерапрыемствы ў крэатыўным фармаце. Агульнагарадскі тыдзень антытытунёвай прапаганды «Нікацін – вораг № 1», наладжаны бярэзінскімі бібліятэкарамі 16–21 лістапада 2015 г., меў на мэце шматвектарны ахоп шырокага кантынгента гарадскога насельніцтва, устаноў і арганізацый Беразіно. У ходзе агіт-кампаніі на працягу 6 дзён тыдня ладзіліся паходныя трыбуны антытытунёвай прапаганды па месцах вучобы, працы, лячэння і адпачынку гараджан.

На базе СШ № 2 Беразіно стартавала акцыя «Школа без тытунёвага дыму». Падлеткам было прадстаўлена шок-шоу «Смерць з табакеркі», сярод 12 юных курцоў праведзена акцыя добрай волі «Памяняй цыгарэту на цукерку» з раздачай цукерак, памятак курыльшчыку і вязаных шапачак, каб не гублялі галаву ад шкоднай звычкі. Прыхільнікі некурэння прынялі ўдзел у эстафеце «Я – супраць курэння», аставілі свае подпісы ў «Чыстай кнізе» пад агульным лозунгам «Мы – за чыстае школьнае дзяцінства без тытунёвага дыму». Заключным акцэнтам школьнай акцыі стала аб'яўленне пачыну «Дзіцячы байкот курэнню ў сям'і» з агітацыяй сярод бацькоў «Мамачка, не куры!», «Тата, кінь цыгарэту!».

Акцыя «Вакзал без тытунёвага дыму» прайшла для пасажыраў Бярэзінскага аўтавакзала і ў аўтобусе гарадскога маршрута № 1, дзе бібліятэкарамі была наладжана паходная трыбуна асветы і прапаганды «Прэч, цыгарэта!», раздача буклетаў і памятак, абмен цыгарэт курцоў на цукеркі, эстафета-пачын «Мы – не курым! Далучайцеся!». Паказальна, што вадзіцель гарадскога маршрутнага аўтобуса № 1 Вячаслаў Петрачкоў 2 месяцы трымае зарок некурэння, а 60-гадовы пасажыр аўтавакзала Міхаіл Францавіч Тарасевіч, які 31 год працаваў зваршчыкам, ніколі не курыў.




З далучэннем актывістак раённага грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын» на базе акушэрскага аддзялення раённай бальніцы для 19 цяжарных жанчын і парадзіх Бярэзіншчыны і Чэрвенскага раёна адбылася акцыя «Жанчыны супраць курэння». Жанчынам была прадстаўлена трыбуна перасцераджэння «Забойца свайго дзіцяці – курачая маці» з раздачай самавыдатаўскіх буклетаў «Мамачка, не забівай мяне нікацінам!». Агіт-кампанія завяршылася дабрачыннай акцыяй «Матулін покрыў – абярэг» з раздачай дзіцячых пледаў (фінансаванне РА ГА «Чырвоны Крыж»), ушанаваннем «Бярэзінскай Берагіні» – загадчыцы акушэрскага аддзялення Марыі Аляксандраўны Гулінай, якая мае падзяку Мітрапаліта Філарэта за плённую працу па ахове мацярынства і дзяцінства, прафілактыцы абортаў.

Акцыя «Калектыў без цыгарэтнага дыму» ахапіла 2 арганізацыі, супрацоўнікі якіх па роду дзейнасці з пратэстам і перасцярогай ставяцца да любога заДЫМлення – раённы аддзел па надзвычайных сітуацыях і філіял ВУ «Барысаўгаз» «Бярэзінскі раён газаснабжэння». Дарэчы, 44% пажараў у жылых дамах выклікае курэнне, па таксічнасці тытунёвы дым у 2,5 разы пераўзыходзіць забруджанасць паветра ад гарэння газавай гарэлкі.

Паказальна, што ў калектыве Бярэзінскага РАНС не курыць 61% супрацоўнікаў, у тым ліку начальнік аддзела Андрыевіч Мікалай Віктаравіч, яго намеснікі, начальнікі пастоў – працуе пачын «Кіраўнік, пакажы прыклад для падначаленых». Эстафета-пачын «Мы не курым! Далучайцеся!» сярод супрацоўнікаў МНС уключала збор подпісаў «Я – супраць курэння», уручэнне сімвалічных «Ордэнаў некурэння» і медалёў «Адзін год без тытуню».

У філіяле ВУ «Барысаўгаз» прыкладам для калег служыць дырэктар Абрамовіч Уладзімір Міхайлавіч, ідэолаг Калінка Генадзь Расціслававіч, галоўны інжэнер Саўкін Мікалай Мікалаевіч, майстры Аўсянскі

Аляксандр Аляксандравіч і Скачко Яўген Валянцінавіч. Узорам для двух дарослых сыноў і маленькага ўнука служыць вадзіцель аварыйнай службы Логвін Пётр Пятровіч. У ходзе агіт-кампаній «Калектыў без тытунёвага дыму» мужчынам адказных прафесій – пажарнікам і газаснабжэнцам – была прадстаўлена трыбуна шок-інфармацыі «Тытунь-наркотык: пад прыцэлам мужчыны», прэзентавана бестселернае выданне, перакладзенае на 20 моў свету «Лёгкі спосаб кінуць курыць» Алена Кара, у мінулым заядлага курца з 30-гадовым стажам, які выкурваў у дзень ад 60 да 100 цыгарэт, распрацаваў уласны спосаб пазбаўлення ад нікацінавай залежнасці. У фінале антынікацінавай акцыі 2 супрацоўнікі газаснабжэння публічна далі зарок некурэння і авансам атрымалі медалі «Адзін год без тытуню».

Суботняя маладзёжная дыскатэка на базе гарадскога кінатэатра 21 лістапада 2015 г. прайшла пад лозунгам акцыі «Дыскатэка без тытунёвага дыму». Са 100 наведвальнікаў дыскатэкі, адпаведна праведзенага бліц-апытання, прыхільнікамі некурэння сябе назвалі 37 чалавек (37%), у тым ліку адна сямейная пара, 2 дэмабілізаваныя з войска. Публічна выкінулі зламаныя цыгарэты ў памыйнае вядро, атрымаўшы ў якасці заахвочвання салодкія прызы і памяткі «Калі ты кідаеш курыць» 25 хлопцаў, у тым ліку 2 былыя вайскоўцы. Непасрэдна ў танцавальнай зале супрацоўнікі бібліятэкі наладзілі паходную агіт-трыбуну «Маладым не да твару цыгарэта» з шок-дэманстрацыяй чорных рэквізітаў – спадарожнікаў курца, характарызуючых наступствы курэння на здароўе, бюджэт, кар'еру, будучае сямейнае шчасце маладых. Завяршылася антытытунёвая акцыя на дыскатэцы аб'яўленнем пачыну «З хлопцамі і дзяўчатамі, ад якіх пахне тытунём, не танцуем!».

Агіт-акцыямі Тыдня некурэння ў Беразіно ахоплена 265 чалавек. У акцыі добрай волі «Памяняй цыгарэту на цукерку» прынялі ўдзел звыш 100 добраахвотнікаў, у эстафеце-пачыне «Мы не курым! Далучайцеся!» – 146 чалавек. Спецыяльна для агіт-кампаніі бібліятэкарамі падрыхтавана звыш 100 інфармацыйных буклетаў і памятак тым, хто вырашыў развітацца з небяспечнай звычкай. Прыхільнікам некурэння і экс-курцам уручана 12 ордэнаў некурэння і 11 медалёў «Год без тытуню».

Водгукі жыхароў Беразіно на бібліятэчныя антытытунёвыя мерапрыемствы і глабальныя праблемы нікацінавай эпідэміі засведчылі неабходнасць новага доўгатэрміновага праекта «Беразіно – за здаровы лад жыцця», якому лагічна стартаваць у 2016 г. да 515-годдзя горада. Традыцыйна рэалізатарамі праекта будзе прадугледжаны паэтапны ахоп арганізацый і ўстаноў тыднямі прафілактыкі табакакурэння, алкаголю, наркотыкаў, брыдкаслоўя з эстафетнымі пачынамі «Мы выбіраем здароўе! Далучайцеся!». Праект зноў не праміне прадэманстраваць місію Бярэзінскай раённай бібліятэкі, не замкнёнай на кніжных справах вытворчай сістэме, а адкрытай відовішчнай структуры раённай культуры, якая нестандартна і аператыўна адгукаецца на праблемы сучаснасці.

**Summary**

Described the working experience during the week of anti-smoking.

**Марыя Вішнеўская**

**Бібліятэкар Варонскай сельскай бібліятэкі дзяржаўнай установы культуры «Астравецкая раённая бібліятэка»**

# Да 60-годдзя У.І. Ягоўдзіка

Сёлета святкуе юбілей – 60-годдзе з дня нараджэння – беларускі дзіцячы пісьменнік Уладзімір Іванавіч Ягоўдзік. 11 лютага, напярэдадні юбілейнай даты, у Варонскай сельскай бібліятэцы сабраліся вучні 4 класа мясцовай навучальнай установы, каб павандраваць з кнігамі вядомага аўтара.



Спачатку дзеці пазнаёміліся з біяграфіяй У. Ягоўдзіка. З дзяцінства ён быў вельмі ўважлівы да кожных дробязей, запамінаў аповеды і паданні, з якімі знаёміў яго дзядуля, цікавіўся гісторыяй свайго краю. Пагэтаму, асаблівае месца ў яго творчасці займаюць казкі, апавяданні і аповесці для дзяцей. Некаторыя яго п'есы («Залатое зярнятка», «Пякла баба калачы», «Усміхніся, прынцэса!») ставіліся ў лялечных і драматычных тэатрах краіны.

Народныя легенды, паданні, загадкі, дзіцячыя гульні, удала ўключаныя ў творы пісьменніка, прысвечаны роднай прыродзе – «Ці вернецца князь Кук?», «Дзівосны карабель» і інш.

Кніга «Сіні калодзеж» змяшчае 100 беларускіх легенд і паданняў. На думку пісьменіка, гэта выданне вельмі карыснае не толькі дзецям, але і дарослым.

Напрыканцы мерапрыемства дзеці праглядзелі мультымедыйны фільм «Пернатые кошки ночи» пра соваў.

Затым віктарыну «Галасы птушак «правёў арнітолаг С.Б. Памецька. Творы Уладзіміра Ягоўдзіка запатрабаваны сёння, як і дзесяткі гадоў таму, бо ён ствараў іх з вялікай любоўю знаўца прыроды.